# БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў САЮЗЕ

## ЦК КП(б)Б—таварышам ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧУ
## Соўнарком—таварышу ГАЛАДЗЕДУ
## ЦК ЛКСМБ—таварышу АЎГУСТАЙЦІСУ

Удзельнікі калгаснай спартакіяды ў Днепрапетроўску ад БССР шлюць вам гарачае большэвіцкае прывітанне.

Мы рады паведаміць вам аб новай перамозе, атрыманай калгаснымі фізкультурнікамі нашай ордэнаноснай БССР. Прымаючы ўдзел у калгаснай спартакіядзе ў Днепрапетроўску, у якой удзельнічала 39 калектываў рэспублік і абласцей Савецкага Саюза, фізкультурны гурток калгаса імя КІМ, Хойніцкага раёна, заняў агульнае першае месца, атрымаўшы першую прэмію. і калгас «Чырвоныя Скарынічы», Менскага раёна, — агульнае другое месца.

Апрача першага і другога месца, занятых калектывамі БССР, нашымі фізкультурнікамі ўстаноўлены чатыры ўсесаюзныя рэкорды па лёгкай атлетыцы і веласіпеду, тав. Мігурскі заняў першае месца ў бегу на 100 метраў з часам 12,1 сек. тав. Давыдская заняла першае месца па прыжках у даўжыню з вынікам 4 м. 40 см.; тав. Руcаловіч заняла першае месца па веласіпеду на дыстанцыі 10 кілометраў.

17 нашых удзельнікаў узнагароджаны граматамі, каштоўнымі падарункамі Камітэта па справах фізкультуры і спорту.

Гэта перамога на днепрапетроўскай спартакіядзе ёсць перамога ўсяго фізкультурнага руху Беларусі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы